19) // Режим доступа: https://www.who.int/ru/emergencies/diseases/novel-coronavirus-2019/advice-for-public. – Дата обращения: 07.11.2020.

5. Постановление Правительства РФ от 27.12.2012 № 1406 «О федеральной целевой программе "Развитие судебной системы России на 2013 - 2020 годы» // Собрание законодательства РФ. 07.01.2013. – № 1. – ст. 13.

6. Постановление Президиума Верховного Суда РФ, Президиума Совета судей РФ от 18.03.2020 № 808 «О приостановлении личного приема граждан в судах» // СПС «Консультант плюс».

7. Валеев, Д.Х., Маколкин, Н.Н. Прогнозирование динамики судебной защиты в условиях цифровизации // Вестник гражданского процесса. – 2020. – № 3. – С. 227 - 243.

8. Севастьянов, Г.В. Арбитраж и судопроизводство в условиях пандемии: к теории "процессуального форс-мажора" // Закон. – 2020. – № 5. – С. 118 - 129.

9. Арбитраж в период пандемии: делимся нашим опытом // Режим доступа: https://arbitration-rspp.ru/news/13-07-2020. – Дата обращения: 07.11.2020.

10. Лукьянова, И.Н. Достоверность электронных доказательств в судебном разбирательстве онлайн (некоторые рассуждения о проблемах электронного правосудия в эпоху "COVID-19" и после) // Законы России: опыт, анализ, практика. – 2020. – № 7. – С. 44 – 50.

11. Вилкова, Т.Ю. Реализация конституционной обязанности государства обеспечить доступ к правосудию в условиях развития цифровых технологий // Актуальные проблемы российского права. – 2020. – № 8. – С. 155 - 163.

# «КАЛЯРОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ» ЯК КАТЭГОРЫЯ ПАЛІТЫЧНАЙ НАВУКІ: ПРАБЛЕМНЫ АСПЕКТ

**М.С. Мамекін**
*выкладчык кафедры паліталогіі*
*юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

Праблематыка, звязаная з «каляровымі» рэвалюцыямі, якія сталі знакавымі з'явамі апошніх дзесяцігоддзяў у палітычным жыцці некаторых краін, працягвае набіраць папулярнасць. Тэма «каляровых» рэвалюцый актыўна абмяркоўваецца ў СМІ і ў экспертнай супольнасці на працягу апошніх гадоў. Спецыялістамі распрацоўваюцца розныя значэнні гэтага феномену, даследуюцца тэхналогіі, вылучаюцца асаблівасці і спецыфіка.

Паняцце «каляровая рэвалюцыя» (як і іншыя паняцці, якія з’яўляюцца прыватнымі прыкладамі «каляровых» рэвалюцый) складаецца з дзвюх частак, дзе адна частка апісвае важныя характарыстыкі і асаблівасці пэўнай палітычнай «рэвалюцыйнай» сітуацыі, падкрэсліваючы «фірменны стыль» [1, с. 4-5] гэтых з’яваў, і самога тэрміна «рэвалюцыя». Каб вызначыць абгрунтаванасць

існавання менавіта такога паняцця, а таксама аддзяляць ад шэрагу роднасных, вызначыўшы пры гэтым ступень адпаведнасці гэтага паняцця працэсам, якія яно апісвае, былі прааналізаваны складнікавыя часткі гэтай катэгорыі.

Як не існуе адзінай дакладнай тэорыі рэвалюцыі, так няма і адзінага азначэння самога паняцця «рэвалюцыя». Адной з самых удалых уяўляецца дэфініцыя Б.А. Ісаева, у межах якой раскрываюцца адметныя рысы рэвалюцыі ў класічным разуменні: «Рэвалюцыя – гэта гвалтоўнае звяржэнне кіруючага рэжыму з наступнай перабудовай усёй палітычнай і прававой сістэмы і глыбокімі рэформамі ва ўсіх сферах дзяржавы і грамадства» [2, с. 44-45]. Разглядаючы тэорыю паняцця «рэвалюцыя» ад яго паходжання ў XVI стагоддзі да сённяшніх дзён, М. Э. Будзіна наступным чынам характарызуе паняцце ў рамках класічнага падыходу: «“рэвалюцыя”вызначаецца як змена існуючага грамадска-палітычнага ладу з наступным пераходам дзяржаўнай улады ад існуючай улады да новай кіруючай эліты» [3, с. 22].

Канец 80-х гадоў XX стагоддзя ў Еўропе быў адзначаны серыяй рэвалюцый антыкамуністычнай накіраванасці, якія прайшлі адносна спакойна (за выключэннем Румыніі), за што і былі ўдастоены назвы «аксамітных» рэвалюцый, бо «аксамітны» – «мяккі», «далікатны», чым падкрэслівае бяскроўны характар тых падзей. Можна зрабіць выснову аб тым, што «аксамітнасць» рэвалюцый азначала адрозненне працэсаў, што адбываліся, ад класічнай пралетарскай рэвалюцыі. Пачатак жа XXI стагоддзя быў азнаменаваны ўзнікненнем новай з’явы, якая ў далейшым стала называцца «каляровымі рэвалюцыямі». Са змястоўнага боку аб'ядноўвае «аксамітныя» і «каляровыя» рэвалюцыі іх няўзброены характар.

Такім чынам, на сённяшні дзень мы з пэўнай доляй упэўненасці можам вылучыць фактычна тры розныя з’явы і, як вынік, тры розныя катэгорыі: класічную, «аксамітную» і «каляровую» (вылучаецца таксама асбоная разнавіднасць «каляровых рэвалюцый», названая «паўзучай» [4, с. 192]. ці «ціхай каляровай рэвалюцыяй». Сцісла аналізуючы асноўныя змястоўныя адрозненні згаданых катэгорый, адзначым, што для класічных рэвалюцый характэрным з’яўляецца змена кіруючай эліты і змена грамадскага ладу. Для «аксамітных рэвалюцый» характэрна звяржэнне дзеючых лідараў і змена грамадскага ладу, а для «каляровых рэвалюцый» – кругазварот існуючых эліт і стары грамадскі лад. Паколькі глыбейшае парўнанне тыпаў рэвалюцыі не з’яўляецца прадметам даследавання, адзначым толькі, што для правільнага суаднясення гэтых з'яў не менш важна разам з мэтамі і вынікамі аналізаваць таксама іх форму і тэхналогіі. Больш падрабязнае вывучэнне адрозненняў «каляровых», «аксамітных» і класічных рэвалюцый праводзілася А. Г. Панамаровай, Б.А. Ісаевым і іншымі.

З улікам вышэйсказанага можна прыйсці да заключэння, якое здаецца лагічным: з пункту гледжання класічнага падыходу ў найменнях «каляровых рэвалюцый» ўжыванне слова «рэвалюцыя» з’яўляецца непрымальным, а больш дарэчна было б выкарыстоўваць паняцце «пераварот». Гэтай пазіцыі

прытрымліваюцца некаторыя даследчыкі, напрыклад, Громава А.В., якая лічыць, што «"каляровыя" рэвалюцыі не змяняюць грамадска-палітычнага ўладкавання дзяржавы, а толькі праводзяць ратацыю палітычных і эканамічных эліт, у сувязі з чым тэрмін «рэвалюцыя» ўжываецца ў дачыненні да іх толькі ў значэнні «перавароту». [5, с. 10].

Аднак існуе і іншы пункт гледжання, паводле якога падзеі, названыя «аксамітнымі» і «каляровымі» рэвалюцыямі, далі штуршок да пераасэнсавання традыцыйнай канцэпцыі рэвалюцый і ўзнікнення новага падыходу. Так, М.Э. Будзіна адзначае, што «з пазіцый "сучаснага" падыходу да вызначэння паняцця "рэвалюцыя", у найменні "каляровыя рэвалюцыі" гэты тэрмін ужываецца цалкам апраўдана, бо на цяперашнім этапе развіцця тэорыі рэвалюцыі рамкі гэтага паняцця становяцца больш размытымі, і пад апісанне "рэвалюцыі" падыходзіць усё больш не толькі сацыяльна-палітычных, але і тэхнічных, навуковых, грамадскіх і іншых змен» [3, с. 28]. Варта заўважыць, што сваім найменнем «каляровыя» рэвалюцыі шмат у чым абавязаны журналістам і піяршчыкам, якія, выкарыстоўваючы ў гэтым паняцці тэрмін «рэвалюцыя», хацелі прыўнесці ў гэта найменне больш значнасці. Падкрэслім, што ў навуковай літаратуры няма адзінства ў вызначэнні сутнасці самой катэгорыі, таму ахарактарызуем яе ў самым агульным сэнсе ў якасці негвалтоўных рэвалюцыйных паліттэхналогій, накіраваных на змену кіруючых палітычных рэжымаў.

Аналіз каларысцкага складніку катэгорыі «каляровая рэвалюцыя», што апісвае важныя характарыстыкі пэўнай рэвалюцыйнай з'явы, робячы яе ўнікальнай, дазволіў зрабіць выснову аб тым, што колер у выбары назвы той ці іншай рэвалюцыі ў шэрагу выпадкаў сапраўды меў сэнс. Тлумачыцца гэта тым, што колеры і знакі адыгралі важную ролю падчас дасягнення мэтаў некаторых «каляровых» рэвалюцый, бо падобныя знакавыя сістэмы ўздзейнічаюць на глыбокія сферы псіхікі больш непасрэдна, чым азначэнні, перададзеныя вербальна. Таму выбар чырвонай ружы, белага кулака на чорным фоне, аранжавага колеру ці сучаснага дзяржаўнага сцяга ў якасці знака не былі выпадковымі. Дарэчы, сістэмнае выкарыстоўванне «фірменнага стылю» (сімволікі і колеру) «каляровых» рэвалюцый стала прынцыпова новай з'явай, што адрознівала іх ад рэвалюцый «аксамітных».

Як адзначае С.М. Сідорчанка, даследаванні ў галіне псіхалогіі колеру даказваюць, што сінія і зялёныя колеры актывізуюць парасімпатычны аддзел нервовай сістэмы, што спрыяе з'яўленню пачуцця спакою і заспакаенняў людзей, тады як чырвоныя, жоўтыя і аранжавыя колеры актывізуюць сімпатычны аддзел нервовай сістэмы, што стымулюе дзейнасць чалавека [6, с. 152]. Колер таксама змяшчае гістарычную алюзію ці каштоўнасны складнік, якіз'яўляецца прынцыповым рычагом выбару і мабілізацыі. Таму нядзіўна, што PR-тэхнолагі і паліттэхнолагі надавалі шмат увагі такому навуковаму напрамку, як псіхалогія колеру, а разам з тым і колера-сімвалічнай атрыбутыцы «каляровых» рэвалюцый. Так, напрыклад, адна з

самых паспяховых «каляровых» рэвалюцый, якая адбылася ва Украіне ў 2004 годзе, афарбаваўшы галоўныя плошчы краіны ў аранжавы колер, атрымала свой знак не выпадкова. Архетып аранжавага колеру задзейнічаўся па прычыне таго, што ён мяркуе ў людзей актыўнасць, пазітыўнае самаадчуванне і жаданне змен [6, с. 152.]. Таксама пры выбары колеру ў якасці знака рэвалюцыі ацэньваўся і папярэднi досвед выкарыстання гэтага колеру. Так, рэвалюцыя ў Кувейце атрымала назву «блакітнай» па прычыне таго, што пратэстоўцы выкарыстоўвалі плакаты менавіта такога колеру.

Нягледзячы на тое, што ў шэрагу выпадкаў колер сапраўды станавіўся знакам рэвалюцыйных падзей, у наступным замацоўваючыся ў найменні гэтых працэсаў, важна адзначыць, што значна часцей прадметам, які выбіраўся ў якасці сімвала, даючы назву рэвалюцыйным падзеям, выступалі аб'екты расліннага і навакольнага свету (напрыклад, рэвалюцыя кедраў у Ліване, твітэрная рэвалюцыя ў Егіпце і інш.). М.Э. Будзінай было праведзена даследаванне, падчас якога было выяўлена 41 найменне рэвалюцыйных падзей, якія праходзілі ў 21 краіне. Па выніках гэтага даследавання колер даў пачатак толькі 19,5 % найменняў падобнага роду падзей [7]. Таксама існуе меркаванне, паводле якога сімвалічныя назвы «каляровых» рэвалюцый, якія фарміруюцца на аснове фірменнага стылю (сімволікі і колеру) пратэстных акцый, сталі фармальнасцю, а рэвалюцыі часта не маюць адзінай ідэнтыфікацыі. [1, с. 6]

З улікам агучаных пазіцый бачыцца, што выкарыстоўванне слова «каляровыя» ў найменні з'яўляецца не зусім апраўданым.

Такім чынам, ужыванне катэгорыі «каляровая рэвалюцыя» на сённяшні дзень падаецца досыць дыскусійнымі можа выкарыстоўвацца ў паліталогіі з пэўнай доляй умоўнасці. Абумоўлена гэта вышэй апісанымі фактарамі, а таксама тым, што ва ўжытак паняцце ўвайшло дзякуючы журналістам і піяршчыкам, а не было распрацавана ў акадэмічных кругах. Аднак трэба разумець, што гэта паняцце, нягледзячы на сваю неадназначнасць, ужо досыць трывала ўкаранілася як у айчыннай, так і ва ўсёй рускамоўнай літаратуры. Заходнія ж палітолагі і СМІ выкарыстоўваюць гэту катэгорыю значна радзей, аддаючы перавагу ў кожным канкрэтным выпадку канкрэтнай назве, якая характарызуе працэс пратэстнай актыўнасці ў асобна ўзятай краіне.

## Бібліяграфічны спіс


1. Родькин, П.Е. Революция потеряла цвет. «Цветные революции» 2004–2014: гуманитарный и коммуникационный феномен войны нового типа. – М.: Совпадение, 2015. – 120 с.
2. Исаев, Б.А. Принцип домино и цепи революций: где, почему и как случаются «цветные революции» // Конфликтология / 2014. – № 4. – С. 43-63.
3. Будина, М.Э. Понятие «революция» в контексте именования «цветные революции» // Вестник ТвГУ. Сер. "Филология". – 2013 № 24 (5). – С. 22–29.
4. Панин, В. Н., Тамбиева, З. С. «Цветные» революции как продукт информационно-коммуникативных технологий: аспекты «эволюции»

«классических» революций // Современная наука и современная наука и инновации. – 2019. – №3 (27). – С. 192-198.

5. Громова, А.В. Роль и место масс-медиа в подготовке ипроведении«цветных революций»: автореф. дис. канд. филол. наук:10.01.10 / А.В. Громова. Рос. ун-т дружбы народов. М.: 2009. – 19 с.

6. Федорченко, С. Н. Фрейм-анализ политической символики "цветных революций": теоретико-методологические и исторические аспекты проблемы // Вестник Московского гос. областного университета. – 2012. – № 3. – С. 64-72.

7. Будина, М.Э. Символы цветных революций в составе их именований // Концепт. – 2014. – № 08. – С. 1-7.

## ВЫЗОВЫ ГОСУДАРСТВУ И ПРАВУ В ЦИФРОВУЮ ЭПОХУ

**Т.С. Масловская**

*доцент кафедры конституционного права юридического факультета Белорусского государственного университета, кандидат юридических наук, доцент*

Государство и право в своем развитии испытывает выраженное воздействие различных факторов, включая динамично развивающиеся информационные технологии. В результате расширяющееся распространение информационно-коммуникационных (а в последнее время появляющихся цифровых) технологий существенным образом влияет на функционирование государства, модернизацию права. Вместе с тем, цифровизация сама по себе выступает одним из глобальных вызовов современному государству.

Термин «цифровизация» в последнее время все чаще встречается в правовой литературе. На наш взгляд, следует разграничивать понятия «информатизация» и «цифровизация»: в основе всего, что связано с «цифрой», лежит искусственная среда, цифровая реальность, цифровая сфера, в которой происходит создание нового продукта в цифровой форме. Следует также учитывать, что информационно-коммуникационные и цифровые технологии также различаются, последние предполагают использование специальных алгоритмов, кодов и пр.

По справедливому утверждению В.Д. Зорькина, «сегодня зарождается новое право – «право второго модерна», регулирующее экономические, политические и социальные отношения в контексте мира цифр, больших данных, роботов, искусственного интеллекта» [1].

Цифровой сектор стремительно развивается, правовая регуляция не всегда оперативно реагирует на появление инноваций. Вместе с тем, некоторые государства принимают акты стратегического характера в этой сфере. Например, в Республике Казахстан принята программа «Цифровой Казахстан», рассчитанная на 2018-2022 годы. Во Франции действует Закон о цифровой Республике 2016 года. На наш взгляд, к цифровизации следует подходить